# Яркія фарбы дзіцячага свята

Свята да Міжнароднага дня абароны дзяцей - фестываль дзіцячай творчасці «Таленты дабрыні» - зладзілі ў гарадскім парку культуры і адпачынку ў Слуцку.

Адкрыла свята і павіншавала юных случчан і іх бацькоў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянціна Вітальеўна Ражанец.

Зоны актыўнасці для дзяцей арганізавалі Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка, Слуцкі цэнтр турызму, райаддзел па надзвычайных сітуацыях. Валанцёры БРСМ сумесна з рэдакцыяй «Слуцкага краю» праводзілі конкурс на лепшы малюнак крэйдай, а падчас акцыі «Падары радасць дзіцяці» раздавалі паветраныя шары і салодкасці. Футбалісты СФК «Слуцк» паказалі майстар-клас па набіванні мяча, правялі аўтограф-сесію, гулялі з дзеткамі, фатаграфаваліся.

Канцэртную праграму падрыхтавалі дзіцячыя калектывы і салісты сельскіх устаноў культуры: Вясейскай дзіцячай школы мастацтваў, Вежскага, Гольчыцкага, Падлескага, Ленінскага, Лядненскага, Ленькаўскага, Вясейскага сельскіх дамоў культуры, Лучнікоўскага цэнтра культуры, Мялешкаўскага цэнтра культуры і вольнага часу. Таленавітыя ўдзельнікі фестывалю творчасці атрымалі падарункі, у тым ліку і салодкія, каталіся на атракцыёнах, а пасля адправіліся на дыскатэку.

Аніматары праводзілі конкурсы, танцавалі з дзеткамі. Было весела!

Слуцкі раённы цэнтр народнай творчасці дзякуе ўсім, хто дапамагаў арганізаваць свята: аддзелу ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Слуцкага райвыканкама, ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат», «Слуцкі хлебазавод» Уладзіміру Ганчарову (ПУП «ВВ АгроРесурсы»), Андрэю Люцко (ПУП «СанТайм»), Андрэю Піхцярову.

Дарэчы, напярэдадні свята дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянціна Вітальеўна Ражанец падарыла наведвальнікам аддзялення для інвалідаў Слуцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва магнітную дошку для заняткаў. Вельмі патрэбны падарунак, адзначае загадчыца аддзялення Ірына Гурына.

Ірына ШЧАРБОВІЧ.